Цана асобнага нумару 20 гр.

Pierasyłka apłačana ryčałtam

№ 26 (525). Вільня, Аўторак 25 Ліпня 1933 г. Год IX (XVII)

Беларуская КРЫНІЦА

Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: ВІЛЬНЯ, Людвісарская 1-19. (Wilno, Ludwisarska 1-19)
Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. ран да 4 гадз. веч.

Цэны абвестак паводле ўмовы.

„Бел. КРЫНІЦА“ каштуе на год—4 зл., на паўгода — 2 зл., на 3 месяцы — 1 зл.. Заграніцу ўдвая даражэй.
ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ

У чым справа?

(Да характэрыстыкі беларускай санацыі).

Грамадзкі абавязак рэдакцыі беларускай незалежнай часопісі дужа нялёгкі. Звычайна трэба нятолькі асьвятляць належна беларускае жыцьцё, надаваць яму адпаведны кірунак, бараніць яго ад ворагаў-чужынцаў, але трэба так-жа час-ад-часу забіраць голас і ў справе тых небясьпек, якія нясуць беларускаму жыцьцю беларусы, што самі ходзяць чужымі дарогамі і на гэтыя дарогі заклікаюць народ беларускі.

Да гэткіх блудных беларусаў у беларускім жыцьці пад Польшчай належаць так званыя санатары, ці проста кажучы польскія ўгадоўцы. У справе кірунку іх працы, якую ўважаем за памылковую і шкодную для беларускага адраджэньня, мы бываем змушаны забіраць голас і для дабра народу належна асьвятляць гэны кірунак. Робім гэта заўсёды рачова і без асабістых нападкаў. З таго-ж боку, нажаль, відаць з недахвату доказаў, звычайна льюцца на нашы галовы памыі і асабістая лаянка.

Да нас часта даходзяць галасы паважных беларусаў вяскоўцаў і інтэлігентаў, каб мы на санацыйны кірунак сусім не зварочвалі ўвагі, ня ўступалі з ім у спрэчкі і не кампрамітавалі сябе самых, бо — кажуць гэтыя людзі — грамадзкую і народную вартасьць полёнафілаў сяньня знаюць усе беларусы і пісаньне аб іх — калі ёсьць пісаць шмат аб чым лепшым — зьяўляецца лішнім марнаваньнем і часу і коштаў. Вось-жа мусімо сказаць, што з гэтым ня сусім так. Мэты, характар і вартасьць сучасных беларускіх полёнафілаў, ці санатараў знае добра беларуская інтэлігенцыя і да таго краёвая, а незаўсёды ў гэтым належна разьбіраецца сялянства і нашая інтэлігенцыя, што змушана быць далёка ад родных гоняў, заграніцай. Тымчасам сучасныя „нашы“ полёнафілы, праводзячы свае проціўбеларускія пляны, па іменьні іх не называюць і часта даволі зручна маскуюць іх і хаваюць. Там людзі не такія простыя і наіўныя, як можа каму здавалася-б. Зразумець і ўбачыць іх укрытыя шкодныя беларусам пляны ня кожны патрапіць. Дзеля гэтага мы, што бачым іх і іх работу зблізка, мусімо час ад часу забіраць аб іх голас і прасьцерагаць прад імі беларускі народ.

Для беларускага народу — для яго нацыянальнага ўсебаковага адраджэньня — дужа небясьпечны, як ведаем, камунізм. У Беларусі пад камуністамі прынцыпова вядзецца барацьба з усякімі беларускімі нацыянальнымі праявамі, а гэта робіцца так зручна, што ня кожны работу гэну ўбачыць і зразумее. Там форма культурнага і грамадзкага жыцьця наагул беларуская, але зьмест заўсёды проціўбеларускі. Гэта знача, што мова беларуская ўжываецца там даволі шырока, у мове гэтай пішуць і выдаюць там даволі многа align рознага роду літэратуры, але тое ўсё, аб чым пішуць і што выдаюць ёсьць сусім не беларускае, або і выразна варожае беларускасьці.

Нешта падобнае, толькі з другога боку, робяць і „нашы“ санатары. Там, у камуністаў, форма беларускага жыцьця беларуская, а зьмест камуністычны, проціўбеларускі, а тут пад Польшчай беларускія санатары ў беларускім жыцьці так-жа стараюцца агулам за хаваць дзе можна мову беларускую, але зьмест у гэта жыцьцё, ці лепш сказаць — душу, устаўляюць польскую. Бо мусімо добра зразумець тое, што сама толькі беларуская мова ў нашым народным адраджэньні не становіць сутнасьці гэтага адраджэньня, што мова наша ёсьць ня мэтай, але толькі найлепшым правадніком да мэты — гэта знача — да самастойнасьці нашага народу духовай, матэр'яльнай і агулам найлепшым правадніком да шчасьця народу. Словам, у роднае слова трэба ўкладаць і родны сэнс. Тымчасам „нашы“ санатары робяць інакш.

Беларуская санацыя выракаецца ідэалу сваей беларускай дзяржаўнасьці, а імкнецца да супольнай дзяржаўнасьці з Польшчай. Пісаў аб гэтым пабеларуску з даручэньня санацыйнага штабу адзін з санатараў у польскай санацыйнай часопісі „Włóczęga“, на што мы зьвярнулі ўвагу ў № 24 сёл. г. „Бел. Крыніцы“.

Тая-ж „наша“ санацыя выракаецца беларускай самастойнай нацыянальнасьці і беларускай самастойнай культуры. Распачаў гэта галава санацыі А. Луцкевіч, які падчас працэсу «Грамады» заявіў судзьдзі сьледчаму, што ён „białorusin polak“ (Судовыя акты справы „Грамады“: Том VI—F, бачына 186).

Санацыйная арганізацыя, для конкурэнцыі з беларускім рухам, Т.Б.А., між сваімі мэтамі мае так-жа мэту „пазнаньне культуры польскай“. Праўда, гэта мэта сама па сабе не благая, каб ня тое, як і дзе яна праводзіцца. Праводзіцца-ж яна сярод беларускага сялянства, якое тое ж Т.Б.А. закідае польскімі кніжкамі. Паўтараем: санацыйнае Т.Б.А. пашырае сярод беларускага насельніцтва польскія кніжкі! Гэта знача—імкнецца яна да полёнізацыі гэтага сялянства! Гэткай працай яшчэ не займаўся ні адзін сьведамы і чэсны беларус.

Так-жа ў кірунку асыміляцыі беларусаў з палякамі вядуць санатары гімназію ў Вільні (дзеля гэтай мэты ў інтэрнаце пры гімназіі трымаюць нават вучняў палякоў), ладзяць па сёлах польскія прадстаўленьні, сьведама мінаюць істотныя беларускія пытаньні ў сваей газэтцы „Родны Край“.

Папярэднікі цяперашняй беларуска-польскай угоды (Аляксюк, Балэйша, Паўлюкевіч, Умястоўскі, Вярнікоўскі, Акінчыц) — гэта ангелы ў параўнаньні з сваімі наступнікамі: Луцкевічам, Астроўскім, Ільляшэвічам і інш. Тыя таго не рабілі, што робяць гэтыя. Праўда, цяперашнія полёнафілы ўсе (хоць ня многа іх і ёсьць) такім ці іншым чынам на польскай пэнсіі і дзеля гэтага так стараюцца, але гэта не апраўданьне! «Капитал пріобрѣсть і невинность соблюсти» — яшчэ нікому ў жыцьці не ўдалося.

Вось у чым справа, вось дзеля чаго мы час-ад-часу забіраем голас на тэмы беларускай санацыі...

Маскаваньне жыцьця.

(Жменя думак з вёскі).

Маскаваньне гэта ўдаваньне таго, чаго сапраўды няма. Вось-жа і сяньняшняе жыцьцё нашай вёскі можна было-б назваць адным суцэльным маскаваньнем, удаваньнем, абманам, а ўласьціва — самаабманам. На належнае адбіцьцё гэтага стану нашай вёскі ў слове, малюнку, гуку трэба чакаць на талент сапраўды мастацкі. Для штодзенных патрэб аднак і агульнай орыентацыі задавольмася сіламі штодзеннымі.

Маскуецца наша вёска сяньня ад калыскі аж да гробу, даслоўна. Чужы гэта ўплыў і шкодны.

Родзіцца дзіця. Вязуць хрысьціць і вышуківаюць імёны Бог ведае скуль, каб толькі было модна, каб зьніклі з памяці Янукі, Пятрукі — Крысі, Марысі. Падрастае дзіця — да імёнаў хрышчаных дадаюцца нязьлічаныя імёны пяшчотныя, натуральна таксама небеларускія, у родзе „квятушэк-мянтушэк“(!); а як пачынае гэта дзіця гаварыць, дык укладаюцца яму словы таксама чужыя. Бацькі, а тымбольш дзяды між сабой яшчэ скрось гавораць пабеларуску, нярaз нават уважаюць сябе за сьведамых беларусоў(!), але да дзіцяці гавораць ужо папольску(!), радзей — парасейску. Што ад гэтай „польшчыны“, ці „расейшчыны“ трэба затыкаць вушы і ўцякаць— гэта іншая рэч, але факт астаецца фактам. І выходзіць што ня толькі варона высядзіць каршуна, але і беларусы несьвядома гадуюць пакаленьне выродкаў—янчараў.*)

Гады плывуць і гэта дзіця йдзе ў школу, натуральна таксама польскую. Тут дзіця навучаецца „кохаць ойчызну“ — але не сваю, „шанаваць ензык ойчысты і звычае“ — але не свае, тут кажуць дзіцяці сьвяткаваць чужыя сьвяткі, кланяцца чужым багом, словам змушаюць яго выракацца ўсяго свайго, беларускага, бо яно „беднае“, „хамскае“ і прымаць чужое, „далікатнае“, „панскае“(!). Ці-ж бы лепей дадумаўся і сам султан Урхан, калі пачынаў пераварочываць хрысьціян на верных сабе магамэтанскіх ахраньнікаў — янчароў?!

„Навука“ гэта аднак „у лес ня йдзе“: як выракацца „хамскасьці“, то выракацца. І колькі-ж ужо бацькоў на старыя калені асталіся пакіненымі ад сваіх „здалікатнеўшых“ дзяцей? А ці гэтыя дзеці вінаватыя? Яны толькі ў практыцы застасавалі тое, што чулі ад сваіх вучыцялёў: яны выракаюцца „беднага“ і „хамскага“, хоць яно і роднае і ідуць за панскім(!), чужым, гэта-ж, толькі „каршуновае пер'е“ з вароняга гнязда.

Ідуць маладыя янчары ў сьвет далей, шукаюць хлеба. І тут ласейшы кусок для таго, хто найдалей „уцёк“ ад „хамскасьці“. То-ж ня дзіва, што цяжка выцягнуць з яго роднае слова, ён яго „забыўся“.—А што з уборамі, што з жыцьцём над стан? Скуль прышла гэта самабойчая шляхоцкая(!) мода марыць сябе і сям'ю голадам, але надымацца над стан і пушыцца індыком? Хто навучыў нашу моладзь уцякаць ад чэснай працы над саматканамі, а самыя саматканы закрываць тандэтнай брыдотай?...

Заходзіцца ў урадавае месца, заходзіцца ў касьцёл-царкву — усюды тоесамае, усюды ўцяканьне ад самога сябе, усюды ўдаваньне, маскаваньне. Толькі калі выведзе нешта нашага янчара з цярпеньня, тады толькі прагавора праз яго „забытая“ натура беларуская, тады адазьвецца ў ім роднае слова, але не як мілы, гоючы гук, а як доўга рапеючая, набалеўшая скула — з болем і агідай... Вось поўадкрыты толькі абраз і вынік „асьвячонасьці“ XX-га стагодзьдзя на беларускай вёсцы. Невясёлы ён, няпрыветны, але праўдзівы. Калі міне гэта янчарства нашых часоў— прарочыць нельга. Мінула аднак янчарства султанскае, ня вытрымае і янчарства панскае: яго зломіць штораз узрастаючая стыхія беларускай нацыянальнай сьведамасьці. А яна, міма ўсе перашкоды, ўсё расьце і расьце...

В. Х.

*) Янчары — гэта прыбочная стража турэцкага султана, складзеная з людзей, якія ў маленстве йшчэ даставаліся ў турэцкі палон і там, сілком перавернения з хрысьціянства на магамэтанства, атрымоўвалі ўмыснае ўзгадаваньне ў вернасьці да султанства і ненавісьці да свайго ж прошлага хрысьціянства. — 1826 г. янчарства было скасавана — рэд.

Польская прэса аб Праваслаунай Мітраполіі.

Апошнімі часамі польская про-урадавая прэса шырака пачала пісаць аб іерархах Прав. Царквы ў Польшчы, а фактычна аб праводжанай імі палітыцы на ўлоньні Царквы. Выступленьні гэныя пачаліся зараз пасьля зладжанае ў Варшаве акадэміі з нагоды юбілею мітр. Дзяніса.

„Ilustr. Kur. Codz." у № 154 ад 5 чэрвеня с.г., пішучы аб тэй акадэміі, між іншым кажа: — „учаснікі (акадэміі — S.) праз хвіліну думалі, што вярнуліся часы расейскае акупацыі ў Варшаве... Польшч ня мае найменшае ахвоты, каб на яе землях быў падтрымліваны расейскі дух і каб высокія праваслаўныя духаўнікі былі контынуатарамі палітыкі Еўлогіяў і холмскіх місыянэраў..." — „Kur. Wil." у № 147 ад 6 чэрвеня зьмяшчае гісторыю выдаваньня ведамых „Холмских Народных Листков", рэдактарам якіх быў архім. Дзяніс, сяньняшні Мітрапаліт і Галава Прав. Царквы ў Польшчы. Абгаварыўшы кірунак гэнае часопісі і мэтады яе супрацоўнікаў, аўтор артыкулу дае наступнае заканчэньне: „...Царква ў Польшчы сапраўды хоць і ёсьць аўтокефальнай, але на яе чале стаяць блізкія супрацоўнікі слаўных абрусіцеляў, а па прыходах, у Кансысторыях і ў Сьв. Сынодзе сядзяць гадунцы холмскае сэмінарыі.

„На безмала 5 мільёнаў праваслаўных вернікаў, расейцаў прыходзіцца толькі 80 тысяч (паводле апошняй перапісі). Зьбіраюцца значныя сумы з прыходаў на карысьць Мітраполіі, якая да сяньня ня можа здабыцца на выданьне рэлігійных часопісаў для Украінцаў і Беларусаў, дагэтуль ня выдана падручніка ў беларускай мове дзеля навучаньня ў школах рэлігіі. Але затое выдаюцца аж дзьве расейскія пэрыядычныя часопісі, у сваёй дэмагогіі пераганяючыя „Холмскія Листки"... маемасьці царкоўныя і лясы прадаюцца, а грошы... разам з надвыжкай наложаных на прыходы „haraczów" ідуць, падобна, на запамогу расейскай Царкве на эміграцыі... Зьмяніліся часы і абставіны, але асобы і мэты пазасталіся тыя самыя", заканчываецца гэтак успомнены артыкул. — „Kur. Parafiny" ад 14 чэрвеня с. г., робячы таксама цэлы рад закідаў, урэшце прыводзіць факт, паводле якога прэтэндэнт на расейскую царскую карону в. кн. Кірыл нашым кіраўніком Мітраполіі, за іх дагэтуляшнюю працу, выносіць публічную падзяку.

Мітраполія павінна зразумець цяпер, што падобныя закіды яна зможа адкінуць толькі тады, калі абапрэцца на народныя масы: беларускія і украінскія.

Паперовыя пастановы гэтых закідаў не запыняць.

S.—i.

У месяцы жнівні «Беларуская Крыніца» выйдзе 10 і 25.

З ГАЗЭТ.

Бэсарабія і Вільня.

Віленская літоўская газэта „Vilniaus Rytojus" (15.VII сёл. г.) пад гэтакім загалоўкам памясьціла артыкул, у якім выражве цікавыя думкі. Аўтор гэнага артыкулу, разважаючы падпісаны 4.VII сёл. г. ў Лёндане васьмярыма дзяржавамі дагавор аб тым, каго належыцца ўважаць за напасьніка, робіць наступныя ўвагі.

Дагавор гэны падпісалі гэткія дзяржавы: Афганістан, Эстонія, Польшч, Латвія, Турцыя, Пэрсія, а так-жа ў гэтым ліку Савецкая Расея і Румынія, хоць гэтыя дзьве астатнія дзяржавы, з прычыны спору за Бэсарабію — якая па вайне ад Расеі адышла да Румыніі — дагэтуль між сабой не падтрымліваюць ніякіх зносінаў. Літва-ж, дзеля свайго спору з Польшчай за Вільню, дагавору гэтага не падпісала. З гэтай прычыны ў польскай прэсе паявілася многа жалю і зьдзіўленьня, чаму Літва не паступіла так, як паступіла Расея, якая і Бэсарабіі ня выраклася і дагавор гэны падпісала разам з Румыніяй. І Літва — пісала польская прэса — магла-б і Вільні не выракацца і дагавор гэны падпісаць разам з Польшчай.

Вось-жа „прыглядзімся — даслоўна піша аўтор успомненага артыкулу — чаму Літва гэнага дагавору не падпісала. Першая прычына, бясспрэчна, бяссумніву — подпіс дэлегата Польшчы. Праўда, гэта прычына не істотная, бо на розных дагаворах, робленых з ведама Лігі Народаў, можна спаткаць подпісы дэлегата Літвы і дэлегата Польшчы. Але гэныя ўсе дагаворы з прынцыповым для Літвы Віленскім пытаньнем на маюць нічога супольнага. Сусім-жа што іншае гэты дагавор, у якім азначаецца паняцьце напасьніка і які выясьняе, што цяперашняя дзяржаўныя граніцы павінны быць захаваны.

„З гэтай прычыны Літва не магла падпісаць успомнены дагавор, бо падпісаўшы яго яна гэтым самым прызнала-б цяперашняе палажэньне, прызнала-б, што Віленская справа ўжо вырашана аканчальна. Маючы, знача, у галаве гэтую справу, Літва дагавору гэнага не падпісала. Затое Літоўскі дэлегат Сідзікаўскас у Лёндане падпісаў асобна падобны-ж дагавор з Савецкай Расеяй..."

Гэтулькі літоўская газэта. Ад сябе можам дадаць, што гэткі палітычны крок літоўскай палітыкі дужа зручны і сапраўды змушае Польшч думаць аб зьліквідаваньні віленскай справы.

М. К.

„Занядбалая магчымасьць."

„*Сталае пашырэньне і разьвіцьцё* кааперацыйнага руху на Зах. Беларусі, які ахоплівае сабой што-раз шырэйшыя пласты перадусім бядняцка сялянскае масы, змушае нас... спыніцца ў пару словах на гэтым пытаньні" (курсыў наш — Рэд.) — гэтак пачала свае даўгія разважаньні на „кооператыўныя" тэмы не „Беларуская Газэта" (№ 3). Трудна сказаць, чаго болей у гэтых „разважаньнях" — тыповага ігноранства ці хранічнай глупоты, як трудна тымчасам сказаць наагул ці сама „Газэта" ёсьць насьледніцай „Працы" ці „Бел. Дня". У кожным разе перамешаны тут гарох з капустай, які стравіць мог-бы хіба толькі конскі жалудак — гэткай „стравай" думае карміць сваіх бедных(!) чытачоў „Б. Газэта". —

І так, коопэрацыяй „Б. Газэта" займаецца не таму, што ўважае яе за карысную для нашага народу (аб гэтым ёсьць стыдлівая гутарка ў канцы стацьці), а дзеля таго, што гэта коопэрацыя *стала пашыраецца і разьвіваецца на Зах. Беларусі* (даслоўна!). Знача, не пашыраліся коопэрацыя на зах. беларускіх землях (без „заслугі", „Б. Газэты"(!)) дык і „Б. Газэце" аб ёй галава не балела б.—Прагаўкнамаваўшы праз зубы нешта незразумелае аб „гаспадарчай кабале мільённых масаў народу" (як-жа йначай?) і пахваліўшы здабычы коопэрацыі(?) „ў Савецкім Саюзе" (натуральна!), „Б. Газэта" пафарызэйску бухнулася ў грудзі, што „да гэтага часу" не прыдавала і не прыдае коопэратыўнаму руху належнага значэньня, як чыньнік, што ўзгадоўвае ў духу... „калектыўнасьці"... „Трэба нарэшце *зламаць*(што за лексікон?!—рэд.)з такімі думкамі... і прыступіць да засноўваньня спажывецкіх (чаму толькі спажывецкіх? — рэд.) коопэратываў", бо гэта — слухайце людзі! — спараліжуе імкненьні беларускіх хадэкаў(!)..." Вось тут то, хоць пры канцы, але вылезла шыла з мяшка: прагаварылася „Газэта" аб што ёй ходзіць. Коопэрацыя на беларускім грунце не да смаку гэтай „Газэце" з дзьвюх прычын: яна ставіць на ўласныя ногі беларускае сялянства, робіць яго трывала незалежным ад тых „багоў", якім гатовы вечна кланяцца „стаўпы" з „Б. Газэты"; а другое — пры гэтым самаадраджэньні беларускіх сялянскіх і работніцкіх мас тыя-ж „стаўпы" ня могуць ці ня ўмеюць ніяк сьпячы сваіх бліноў, бо не разумеюць, што такое позытыўная гаспадарчая праца. І тут прычына таго крыку і суматохі сярод жаласьці годных „Газэта'ўцаў".

Ролю і значэньне беларускай хадэцыі ў *разьвіцьцю і пашырэньні* коопэрацыі на зах.-беларускіх землях пакінем з лёгкім сумленьнем для ацэнкі гісторыі нашых часоў. Для сучасьнасьці-ж досыць засначыць, што хадэцыя нігдзе і ніколі коопэратыўных пляцовак не ўважала і не ўважае, як свае партыйныя экспозытуры. А што адзін-другі чалавек з хадэцыі прымае чыннае ўчасьце ў коопэратыўным руху (дзе сягоньня ў незалежна-беларускім руху няма бел. хадэкаў?), дык ніхто з здаровым розумам ім гэтага за зло ня можа рахаваць. Урэшце ў коопэрацыі гэтулькі працы, што досыць знойдзецца там месца кожнаму беларусу, хто толькі хоча на гэтым полі шчыра працаваць.

Дык няма чаго ламацца ў адчыненыя

Kastuś Kalinoŭski, „Mužyckaja Praŭda" i ideja Niezaležnaści Biełarusi.

(*Referat Ks Ad. Stankiewiča, pračytany na ŭračystaj Akademii 25.III.33 h., z pryčyny 15-ych uhodkaŭ abwieščańnia Niezaležnaści Biełarusi i 70-ych uhodkaŭ biełaruskaj presy. Drukujem pawodle stenahramy*). (9).

IX. K. Kalinoŭski i dalejšy los idei niezaležnaści Biełarusi.

I tak Kalinoŭski — heta pieršy naš wialiki baraćbit za wolnaść socyjalnuju i za samastojnaść narodna-palityčnuju biełaruskaha narodu, a tak-ža častkowa i za wolnaść narodaŭ, zasialajučych byŭšaje Wialikaje Kniastwa Litoŭskaje. Za hetuju wialikuju ideju jon zmahaŭsia, pracawaŭ i na aŭtary lubowi baćkaŭščyny i narodu złažyŭ maładoje žyćcio swajo.

Značeńnie Kalinoŭskaha dla biełaruskaj palityčnaj samastojnickaj dumki sapraŭdy wialikaje. Sprawa palityčnaj i hramadzkaj samastojnaści našaha Kraju i sprawa samastojnaści kulturnaj narodaŭ hetaha kraju, a ŭ ich liku i biełarusaŭ, zamiorła razam z Wialikim Lwom Sapiehaj, jakoha sioleta 300-lećcie śmierci prypadaje, ale zamiorła časowa. Prajšło 230 hadoŭ i hetuju sprawu ŭskrasiŭ imienna K. Kalinoŭski i pawis za jaje na šybienicy. Jon sapraŭdy ŭskrasiŭ dziaržaŭnickuju federacyjnuju ideju ziamiel byŭšaha Wial. Kn. Litoŭskaha, jakim jano faktyčna było jašče pašla Lublinskaj Unii, za časoŭ Lwa Sapiehi, — ale Kalinoŭski ŭžo pradusim zwaročwaŭ uwahu na narod biełaruski, na jaho socyjalnyja i palityčna-nacyjanalnyja patreby pawodle sučasnaha sabie razumieńnia i začaŭ takim čynam u jabo raźwićci eru zmahańnia za poŭnuju niezaležnaść Biełarusi.

U toj čas, kali narod byŭ jašče poŭnym niawolnikam, bo stahnaŭ jašče ŭ jarmie panščyny, kali całkom zabyŭšysia byŭ ab sabie samym u sensie nacyjanalnym, kali ciarpieŭ tak-ža niawolu palityčnuju rasiejskaha na jaho najezdu, kali, ahułam haworačy, ciemra biesprašwietnaja i, zdawałasia, bieznadziejnaja zalahała Biełaruś, u toj kažu čas: padniać ściah za wyzwaleńnie narodu, ustupić u tak niaroŭnuju baraćbu za wolu hetaha narodu i mieć wieru ŭ sens hetkaj baraćby — sapraŭdy moh tolki wialiki duch, swajho rodu hienij. Kalinoŭski-ž sapraŭdy byŭ hetkim.

Praŭda — warožyja siły pieramahli wialikaha syna Biełarusi i zawiali jaho na šybienicu, tryumfujučy, što razam z im nazaŭsiody zamučyli i jahonuju wialikuju ideju ab wolnaści i samastojnaści biełaruskaha narodu. Tak jany dumali, a Kalinoŭski inakš i tady dumaŭ. U piśmie swaim z-pad sybienicy, pisanym šłaźmi krywawymi, bo čakajučy śmierci, pryrakaŭ jašče narodu swajmu lubamu, „mužykom" swaim darahim „z taho świetu adazwacca." Adazwacca swajej idejaj, swaimi dumkami, uskrasić ich nanowa, zapalić imi šyrokija narodnyja masy i wieśći ich da poŭnaha wyzwaleńnia. I nia treba być mistykam, kab bačyć, što heta ŭsio sianńia sapraŭdy robicca.

Kalinoŭski zawis na šybienicy, jak achwiara swajej lubowi da narodu, da praŭdy wyšejšaj i sprawiadliwaści, jak achwiara swajho palityčnaha romantyzmu. Ale ničoha, hetak treba było. Jahonaja śmierć, śmierć wołała, stałasia ziarniom uskrašeńnia našaha narodu, stałasia duža płodnaj u skutkach swaich. U jakich tryccać hadoŭ pa śmierci Kalinoŭskaha jahony sučaśnik, a mahčyma i znajomy, patryarch našaha sučasnaha adradžeńnia Fr. Bahuševič pawioŭ dalej ideju Kalinoŭskaha, ale nawučany i natchniony jaho prykładam, pawioŭ jaje inšaj darohaj, inšym sposabam, darohaj budžeńnia ŭ narodzie świedamaści nacyjanalnaj i socyjalnaj. Hetym idejam słužyli i sianńia jašče adčasci služać jahonyja nie-

Перамогу заплацілі жыцьцём.

Два літоўскія лётчыкі, Гірэнас і Даріус, у палове г. м-ца вылецелі аэропланам з Амэрыкі на Бацькаўшчыну, у Незал. Літву. Пралёт над морам лётчыкам удаўся і ўжо прад самай мэтай, бо ў брандэнбурскай правінцыі, ў Нямеччыне каля Штэттіна, 17 г. м., з нявытлумачаных дагэтуль прычын, самалёт зваліўся на зямлю і разьбіўся, хаваючы на векі пад сабой і храбрых пераможцаў акіяну. — Гэта здарэньне акрыла славай Народ літоўскі, а за перавозам цела нябошчыкаў у Літву і паховінамі сьлядзіў з падзіўленьнем і прызнаньнем цэлы культурны сьвет.

З беларускага жыцьця.

З выдавецкай нівы. Выйшаў з друку зборнік сцэнічных твораў Л. Родзевіча: Зьбянтэжаны Саўка, Пасланец і Конскі патрэт (лацініцай). Выданьне Я. Найдзюка. Цана зборніка 50 грошаў Галоўны склад у беларускай кнігарні „Пагоня."

Biuluteń Ab'jednańnia Biełaruskich Studenskich arhanizacyj, Nr 5, Lipień 1933 hod Praha — выйшаў з друку. З бюлетэню даведваемся між іншым, што сёлетні XV ты кангрэс CIE (міжнароднай студ. конфэдэрацыі) адбудзецца ў Вэнэцыі (Італія) ад 23 жніўня да 2 верасьня. Дэлегатамі ад АБСА на кангрэс зьяўляюцца: Др Ермачэнка і Д р Вітушка (Прага), Н Гаўрылічанка і Я. Шутовіч (Вільня) і А. Шкутка (Бэрлін). — Затрымка толькі ў тым, што АБСА ня мае сродкаў, за якія маглі-б сваю дэлегацыю на кангрэс выслаць.

БЕЛАРУСЫ Ў ЛІТВЕ.

Культурная хроніка. — 6 травеня с. г. у ўгодкі адчыненьня „Беларускай Хаткі" ў Коўні быў пастаўлены спэктакль вечар. Адчыніў вечар прамовай віцэ-старшыня грам. А. Матач, а студэнтка-паэтка Л. Романэйка прадэклямавала пры гэтым свой верш прысьвячаны гэтым-жа ўгодкам. На сцэне пасьля гэтага пад кіраўніцтвам грам. К. Плескачэўскай была пастаўлена камэдыя Ул. Галубка „Суд", а хор з аркестрам балалаечнікаў выканаў 10 беларускіх народных песьняў і беларускі народны гымн. („Літ. Г." № 125).

— 3 чэрвеня с. г. „Аб'еднаньне беларусаў-студэнтаў Унівэрсытэту Вітаўта Вялікага" ў Коўні ладзіла ў памешканьні тэй жа „Хаткі" (вул. Крашэўскага 34) вечар літоўска-беларускага збліжэньня. Запрошаны былі літоўскія студэнты і літоўска-беларуская інтэлігенцыя. Пастаўлена была пры гэтым аднаактоўка Я. Башкіра „Гурток", прадэклямаваны цэлы рад беларускіх вершаў і прасьпяваны беларускія народныя песьні. Пры паданай пасьля гэтага гарбатцы адбываўся вольны абмен думак паміж прысутнымі, а ў міжчасе пачынаючыя беларускія і літоўскія паэты-пісьменьнікі выступалі з сваімі-ж творамі. („Эхо" № 153.)

— 14 чэрвеня с. г. Беларускі Народны Тэатр ставіў у памешканьні „Беларускай Хаткі" 3 актовую п'есу О. Сахаравай „Птушка на волі". Прадстаўленьне прайшло вельмі ўдала. („Эхо" № 163).

— Той жа тэатр у аб'езднай туры выступаў у Вілкаміры (8 ліпеня) і ў Янаве (9 ліпеня). У Вілкаміры грам. А. Матач прад прадстаўленьнем прачытаў папулярную лекцыю на тэму „Беларусы і іх культура", даказваючы неабходнасьць літоўска-беларускага супрацоўніцтва. Пасьля лекцыі пастаўлена была 3 актовая камэдыя Фр. Аляхновіча „Пан Міністр". Як лекцыя, так і прадстаўленьне прайшлі вельмі ўдачна. („Эхо" № 187).

А—к.

дзьверы і пісакам „Газэты"; замест гэтага, калі хто з Вас можа, прылажэцеся чынна да коопэрацыі. Хадэцыя Вам гэтага напэўна за зло рахаваць ня будзе, а толькі прывітае.

А тады ня трэба будзе ламаць рук над „Занядбалай (чаму не занядбанай?) магчымасьцю".

Хадэк.

З украінскага жыцьця

„УНДО". Паміж здарэньняў у палітычным жыцьці Украінцаў пад Польшчай за апошні час трэба ўспомніць перад усім аб падзеях у „Украінскім Нацыянальна-Дэмократычным Аб'еднаньні (УНДО)." Вось жа на паседжаньні Ц. К-ту гэтага „Аб'еднаньня" 15 г. м. дайшло да выступленьня, эвэнт. выключэньня з партыі і Ц. К-ту сябры К-ту рэд. Дм. Палііва. За ім дабравольна вышлі пасол Кохан і Постолюк. Рэд. Палііву закідалася, што ён, належачы да партыі і Ц. К-ту, выступаў адначасна супроць іх у прэсе.

Прасьлед Украінцаў у Саветах набірае асаблівага выгляду, а ў знак пратэсту супроць гэтага прасьледу адбіраюць сабе жыцьцё выдатныя украінскія камуністы. Гэтак нядаўна йшчэ налажыў на сябе рукі пісьменьнік бальшавіцкі, Украінец М. Хвильовий, а апошнімі днямі выстрэлам з рэвальвэру пакончыў сабе жыцьцё намесьнік старшыні Рады Камісараў Савецкай Украіны і Камісар Асьветы, а адначасна сябра Ц. К. партыі М. Скрипник. — Гэтыя падзеі адчынілі вочы і некаторым прыхільнікам бальшавізму з гэтага боку рыскай граніцы. Гэтак б. сельробаўскі пасол (не „змаганскі") С. Валынец апублікаваў усе ведамыя яму жудасьці бальшавіцкага панаваньня і пакінуў сваіх колішніх аднадумцаў.

Школьная анкета.

(*Працяг, гл. „Бел. Крын." № 25*).

Опэская валасьць, Браслаўскага пав. У нашай валасьці ані ўтраквістычнай, ані тымбольш беларускай школы няма. Польскіх-жа школ па вёсках раськінена аж адзінаццаць. Праваслаўных дзяцей у нашых школах няма, а каталікоў вучаць рэлігіі папольску. Малым дзяцям вельмі цяжка прыходзіцца навука ў чужой ім польскай школе, бо сядзяць там па тры гады ў першым аддзеле, пакуль асвойтаюцца з польскай мовай. — Сяляне нашы ў вялікай часьці йшчэ нясьведамыя таго, што значыць школа, а тымбольш школа родная. Яны праціўны сучаснай школе, але часта не дзеля таго, што гэта школа чужая, а дзеля таго, што вынікі навучаньня ў гэтых школах вельмі нездаваляючыя. Сяляне нашы проста кажуць, што „школа псуе дзяцей" і ў гэтым маюць шмат праўды. Шкоднае затое перакананьне пашырана паміж нашымі сялянамі, што селяніну-земляробу наагул школа непатрэбная ды што калі дзіця прахадзіла ў школу якіх пяць зім, дык ужо ня можа „марнавацца" на гаспадарцы, але мусіць ісьці ў чыноўнікі. А дзеля таго, што ў „чыноўнікі" (такі там і чыноўнік за пяць зім!) лягчэй папасьці з школы польскай, дык школа польская ўваччу гэткага нясьведамага селяніна ёсьць нечым „вышэйшым"... Словам, уся „полышчына" нашай валасьці, гэта рэха нашай-жа цемнаты. Там аднак, дзе толькі прамень сапраўднай асьветы пранікае, там будзіцца і нацыянальная сьведамасьць.— У гэтым наша сіла і ў гэтым залог нашай перамогі.

Дзядзька Гаўрыла.

Аксютава, Богінскай гм. Браслаўскага пав. У богінскай гміне амаль усе беларусы, па веравызнаньні: каталікі і праваслаўныя. Палякоў і іншых народнасьцяў можна злічыць на пальцах; а пра школу беларускую і слыхаў ня было і няма. Дзяцей беларускіх вучаць у польскіх школах і папольску. Рэлігіі каталіцкіх дзяцей вучаць папольску, а праваслаўных, хоць вельмі рэдка, сьвяшчэньнікі вучаць парасейску. Узгадаваўчага ўплыву на беларускіх дзяцей у польскай школе няма. Прахадзіўшы 3—4 гады ў школу дзеці гаварыць правільна ня ўмеюць. Наракаюць бацькі на цяперашняе навучаньне, што іх дзеці, ходзячы па некалькі гадоў у школу, толькі страты паносяць — дзеручы абутак і вопратку, нішчачы школьныя прылады, а карысьці з гэтага няма ніякай.

Усе добра разумеюць аб патрэбе асьветы і вельмі ахвотна пасылалі б сваіх дзяцей

śmiarotnyja „Biełaruskaja Dudka" i „Smyk".

Zaraz-ža paśla śmierci Bahuševiča († 1900), na samym parozie našaha XX st. pajaŭlajucca ŭžo nia tolki asoby, što dalej budziać biełaruski narod da abarony swaich hramadzka ekanamičnych prawoŭ i što budziać u im biełaruskuju nacyjanalnuju świedamaść, ale pajaŭlajucca ŭžo pačatki hramadzka-palityčnych dumak, pradusim dwuch: z ideolohijaj rewalucyjna socyjalistyčnaj i chryścijanska ewalucyjnaj, jakija pracu swaju prawodziać užo sposabam arhanizawanym, hramadzkim, sposabam faktyčna adzinym, što sapraŭdy wiadzie da mety, da niezaležnaści našaha narodu.

Pryšła ŭrešcie suświetnaja wajna i wialikaja rasiejskaja rewalucyja. Rasieja, turma narodaŭ, upała i niekatoryja z hetych narodaŭ patwaryli swaje ŭłasnyja narodnyja chaty. Da hetaj budowy bralisia i biełarusy. Wolu swaju žyć žyćciom wolnym i samastojnym wyjawili jany hramahłasna na świet uwieś 25.III.18 h. praz siabraŭ Bieł. Rady Respubliki, jakaja rod swoj wywodziła ŭ prostaj linii ad Usiebiełaruskaha Kanhresu, što adbyŭsia ŭ sercy Biełarusi Miensku ŭ śniežni 1917 h.

A akcie 25.III.1918h. akazaŭsia nam uznoŭ Kalinoŭski, jahonyja ideały ŭwaskreśli ŭwa ŭsiej swajej krasie. Uwaskreśli jany z bolšaj užo siłaj, u šyrejšych užo ramkach.

Akt 25.III.18 h., snujučy dalej dumku wialikaha Kalinoŭskaha, ale ŭžo nieahladajučysia na nijakuju łučnaść, na nijakuju federacyju ani z Polščaj, ani tak ža z Rasiejaj, zrabiŭ jašče krok upierad i wyjawiŭ wolu biełaruskaha narodu, što jon wolny i całkom ad nikoha niezaležny, što jon sam haspadar na swajej ziamli.

Praŭda, i hety akt tak i astaŭsia aktam na papiery. Prawieści jaho ŭ čyn nie dali nam samalubnyja susiedzi našy, tyja-ž samyja, što zmahalisia z Kalinoŭskim i što zawiali jaho, razam z idejami jahonymi, na šybienicu. Ale i heta nipačom. Biełarusy nie padajuć ducham: dumku Kalinoŭskaha z-pad šybienicy ab woli i ščaści narodu, praz akt 25.III.18h., praz niadaŭnuju pracu nacyjanalnaj častki „Hramady" i praz pracu ciapierašnich biełaruskich kulturnych i palityčnych niezaležnych arhanizacyjaŭ prawodziać u žyćcio. A skutki pracy hetaj widawočnyja: siańnia treba śćwierdzić, što narod naš maje ŭžo wialiki zapas świedamaści i socyjalnaj i palityčna-nacyjanalnaj i što narod hety maje jaŭnuju wolu žyć i być haspadarom na swajej ziamli. I prydzie čas — mo nia skora, ale prydzie,— kali wolu hetu swaju jon wyjawić i ŭ čyn adzienie. Dla hetaha treba tolki adpawiednaha času, adpawiednaha pawadyra, Kalinoŭskaha nowaha, sučasnaha treba. Wierym, što jon sapraŭdy pryjdzie!...

Praŭda, žywiemo ŭ času, kali hrubaja siła panuje na świecie, jakaja i nas dušyć i ciśnie da ziamli, my adnak wiedajemo, što panawańnie jaje nia wiečnaje. My žywiom u časie, kali nia zwonić nam nijaki „Zwon" miłahučny, jaki zwaniŭ palakom, kali jany krywawilisia ŭ paŭstańni. rwučysia da swaje samabytnaści. Mimawolna pytajem tut — dzie polskija Herceny, Bakuniny, Ogariewy, a tak-ža dzie hetkija samyja wialikija šlachotnyja duchi sučasnaj Rasiei ci čyrwonaj, tam u domu, ci biełaj—na emihracyi? Niama adkazu na heta pytańnie. Nam zwoniać siańnia nie zwany spahady i pryznańnia, a zwany inšyja, całkom inšyja.

Ale i heta ničoha. Sprawiadliwaść pieramahaje. Adno tolki bolš lubowi i wiery da narodu i achwiarnaj pracy nad im, z narodam dla narodu, jak rabiŭ Kalinoŭski, a tady — zakonču jaho-ž sławami — „zdabudziem takuju wolnaść u našaj baćkaŭščynie, jakoj ani našy baćki, ani našy dziady nia bačyli"...

I tahdy bratom swaim, siańniašnim našym pieramožcam i waładaram ad ščyraha biełaruskaha serca praciahniem ruku swaju dziela zbratańnia, dziela ŭskrašeńnia wialikaha ideału: wolnyja z wolnymi, roŭnyja z roŭnymi, ab čym śniŭ, dziela čaho pracawaŭ i za što pawis na šybienicy naš słaŭny Kastuś Kalinoŭski!..

Kaniec.

Прасьцерагаем і заяўляем!

Да нашага ведама даходзіць, што на адрэсы нашых падпішчыкаў, чытачоў і супрацоўнікаў рассылаюцца: пабеларуску пісаная „Беларуская Газэта" і паукраінску пісаная „Ілюстрована Газета". Заяўляем дзеля гэтага, што абедзьве газэты (лік і назовы іх могуць мяняцца) ня маюць з намі нічога супольнага і рассылаюцца толькі паводле **выкрадзеных** ад нас адрэсоў.

Вільня, ліпень 1933 г.

Рэдакцыя і Адміністрацыя
„БЕЛАРУСКАЙ КРЫНІЦЫ“.

у такую школу, якая была-б блізка душы дзіцяці, адчувала-б яго псыхіку і была-б для яго зразумелай. Адным словам адчуваецца вялікая патрэба роднай школы, г. зн. — беларускай. Я. П.

Мураваная Ашмянка, Ашмянскага пав. У нас і ў нашых суседніх мяйсцовасьцях школ беларускіх няма, а толькі польскія. Навучаньне рэлігіі адбываецца ў мове польскай. Дзеці ходзяць да гэтых школ па гадоў сем, а карысьці жаднай з гэтага няма. На тэй кніжцы, на якой вучыліся, то сяк-так прабэкаюць, а як возьме іншую, то ані бэ ані мэ. А пісаць так-жа ня ведаюць як зачаць. Усё гэта дзеля таго, што гэта вучэньне для нашых беларускіх дзяцей у незразумелай мове ёсьць недаступным. Трэба нам з гэтым усім змагацца, трэба дамагацца свайго роднага.

—Дня 2 ліпня с. г. адбылася ў нас лекцыя на тэму: „Францішак Багушэвіч і яго творчасьць". Лекцыю прачытаў грам. Язэп Ярмалковіч з вёскі Юшкі Віленска-Троцкага пав. На лекцыі народу было многа, усе былі зацікаўлены і здаволены з лекцыі.—У нас народ стаў ужо патроху ўсьведамляцца, падрастаючая моладзь ахвотна чытае кніжкі беларускія, а старэйшыя, каторыя былі „цьвёрдыя палякі", дык і тыя сталі праціраць свае заспаныя вочы і сталі называць сябе беларусамі. Дык дарагія браты, стойце на цьвёрдай дарозе.

Яська Браздуна.

Баранавіцкі павет. У нашых дзьвюх вёсках: Іванавічы і Саўцэвічы, лічачых больш 500 жыхароў, школы няма, ня гледзячы на тое, што перад вайной яна была. Сяляне некалькі гадоў яе стойка дамагаліся, бо дрэнна адзетыя дзеці мусяць хадзіць у школу ў Моўчадзь, за тры км. ад вёскі. Дзеля гэтага, паміма значнага ліку вучачыхся дзяцей, вельмі мала іх аканчвае школу, а шмат проста марнуе час і здольнасьці, седзячы ў ваднэй клясе па некалькі гадоў. Жыхары тут выключна беларусы-праваслаўныя. У значнай большасьці пад паглядам нацыянальным усьвядомленыя. Дацэньваюць яны значэньне свае роднае школы, доказам чаго зьяўляецца факт, што ў апошнія гады дзеці, акончыўшы 7-аддзяловую школу, ідуць толькі ў беларускія гімназіі. У 7-х кл. школе ў Моўчадзі несарганізаванае беларускае грамадзянства мае слабы голас, бо супроцьстаўляцца яму палёнізатарскія „jednostki wpływowe", маючыя вялікі доступ і голас у „моцных". Навучаньне рэлігіі праваслаўнай скрось адбываецца ў мове расейскай, а каталіцкай—у польскай.

Трахім З.

З Польшчы.

Справа „берасьцейскіх вязьняў" разглядалася другі ўжо раз у Варшаўскім Апэляцыйным Судзе ад 10 да 20 ліпня. Суд зацьвердзіў прыгавар Акружнога Суду з 13.I.32г., каторы, як ведама, падпісала толькі двух судзьдзяў, а трэці адмовіўся. Абарона абвінавачаных заявіла, што прыгавару ня прымае і складае касацыйную скаргу ў Суд Найвышэйшы.

Дружба Польшчы з бальшавікамі апошнім часам прымае формы аж дзіўных фліртаў, а адведзінам розным дык і канца няма. Гэтак гасьціў у Польшчы нядаўна, вельмі шумна ўсюды спатыканы, савецкі журналіст і палітык, галіцыйскі жыдок Іцка Собэльсон (Карл Радэк). Яшчэ ня выехаў Собэльсон, як прыехалі двумя дарогамі два савецкія лётчыкі, і то самыя камандзеры.—На каго цяпер чарга?

Колькі і каму Польшча вінавата? Паводле статыстычных падлічэньняў эмісыйныя даўгі Польшчы на дзень 1 ліпня с. г. выносілі: 5 проц. даляровая пазычка 1920 г. — 19.574.000 дал.; 8 проц. пазычка даляр. 1925 г. — 23.100.000 дал.; 7 проц. пазычка стабілізацыйная 1927г. – 47.895.000 дал.;7 проц. пазычка стабілізацыйная – 1.545.000 фунтаў штэрлінгаў; 7 проц. стабіліз. пазычка 299.000 ліраў італьянскіх; $6\frac{1}{2}\%$ пазычка дал. 1930 г. 31.729.706 дал.; Прынятыя даўгі прадваенныя па Аўстрыі: аўстрыяцкай рэспублікі 335.000 шылінгаў, Чэхаславаччыне – 17.100.000 франкаў швайцарскіх; Даніі — 361.200 карон данскіх, Францыі 2.316.983.186 франкаў францускіх, Голяндыі —1.917.967 флёрэнаў гол.; Нарвэгіі — 17.068.800 карон нарвэскіх і 1.260 фунтаў штэрлінгаў; Швэцыі — 6.253.200 карон швэдзкіх і Швайцарыі — 75.600 фран швайцарскіх.—Калі і хто гэта сплаціць?

Паводка страшная прайшла над заходняй і паўдзённай Польшчай.—У Галіччыне выступіў з берагоў Днестр з сваімі прытокамі і панарабляў шмат страт. Былі ахвяры нават людзкога жыцьця.

З заграніцы.

Гаспадарчая конфэрэнцыя ў Лёндане сапраўды дагарае да канца. Працуюць — быццам — толькі ў камісіях, а на агульныя сходы ня маюць з чым зьбірацца, стыдаючыся, відаць, самых сябе. Савецкі камісар Літвінаў выступіў на гэтай конфэрэнцыі з праектам дагавору аб эканамічным ненападаньні. Праект гэты, як звычайна, павандраваў пад „зялёнае сукно" адумысловай камісіі. —Усё паважней думаюць аб адсрочцы нарадаў конфэрэнцыі, «пакуль супакоіцца «валютная рэвалюцыя.»

Пакт чатырох ужо аканчальна падпісаны і ўваходзіць у сілу. Што ён прынясе больш з сабой — тымчасам няведама. Тымчасам аднак ангельскі міністр заграчных спраў Саймон заявіў, што падпісаньне „пакту чатырох" (Англіі, Францыі, Нямеччыны і Італіі) гэта толькі пачатак вялікай міжнароднай акцыі, якая павінна давесьці да перагляду г. зв. мірных дагавораў ды рэвізіі граніц між Польшчай і Нямеччынай з аднаго боку, а так-жа між Вугоршчынай і Малой Антантай—з другога. Гэту-ж дагадку пацьвярджае, здаецца, і намер чэхаславацкага міністра Бэнэша адбыць паездку ў Рым да Мусолініга, які сяньня сапраўды трымае лейцы ў міжнароднай палітыцы.

Літвінаў — савецкі камісар заграчных спраў у міжчасе таксама не драмае і, забясьпечваючы Саветам плечы на выпадак, калі-б прышлося счапіцца за чубы на Усходзе з Японіяй, лоўка туманіць галовы дыплёматам Заходу. Гавораць нават паважна, што Літвінаў мае сёлета дастаць «мірную» нагароду Нобэля.

У Нямеччыне далей умацоўвуецца ўрад Гітлера. — 8 г. м. віцэканцлер ф. Папэн, ад імя нямецкага ўраду, падпісаў з Ватыканам дагавор (конкордат), паводле якога р.-каталіцкаму духавенству будзе забаронена займацца палітыкай, але ўрад з свайго боку дае запаруку вольнага разьвіцьця і працы для каталіцкіх арганізацыяў непалітычных.

На Далёкім Усходзе, пасьля парумесячнага замірэньня, узноў пачаліся баі паміж кітайцамі і японцамі на граніцах правінцыі Джэхоль.

ВІЛЬНІ.

Бура з градам над Вільняй і ваколіцай пранеслася а паўдня 24 г. м. У шмат мясцох вада пазалівала сутэрэны і панішчыла каналізацыйныя і брукарскія працы.

Публічнае абурэньне і згаршэньне выклікаў у Вільні пастулак пралата кс. Ціхоньскага, які тыдзень таму назад выкінуў з сутэрэнаў свайго дому артыстычную працоўню ведамага мастака-скульптара Р. Яхімовіча, за тое толькі, што той, адрэмантаваўшы на свой кошт успомнены сутэрэн, ня здолеў у час заплаціць наёмных грошай, бо сам мастак цяпер безработны. — Чым гэта кончыцца?

Цана на грошы. За доляр 24 г. м. плацілі 6 зл. 35 гр., а за рубля золатам—4 зл. 83 гр.

Kuratorjum
Okręgu Szkolnego
Wileńskiego
w Wilnie
Dnia 4 lipca 1933r.
Nr. II-16480/33
Sprawa:

Do Pana Redaktora
czasopisma „Biełaruskaja Krynica"
w Wilnie.

Na podstawie art. 21 dekretu z dnia 7 lutego 1919 roku w przedmiocie tymczasowych przepisów prasowych (Dz. Praw Państwa Polskiego z roku 1919 Nr. 14 poz. 186) w związku z ukazaniem się w Nr. 20 z dnia 21 go maja b. r. „Biełaruskaj Krynicy" notatki pod tytułem: „Likwidacyja pradaužajecca" oraz w Nr. 21 z dnia 28 maja tegoż czasopisma artykułu wstępnego pod tytułem: „Białorusini-Polacy i Biełarusy" — Kuratorjum Okręgu Szkolnego Wileńskiego prosi o umieszczenie w najbliższym numerze „Biełaruskaj Krynicy" następującego sprostowania:

1. Nieprawdą jest, że Dyrekcje białoruskich filij gimnazjow państwowych w Wilnie i w Nowogródku otrzymały od Kuratorjum Szkolnego powiadomienie o tem, że tegoroczne egzaminy maturalne w obydwóch gimnazjach mają się odbywać wspólnie z „macierzystemi gimnazjami" polskiemi, natomiast prawdą jest, że Dyrekcje filij białoruskich państwowych gimnazjów w Wilnie i Nowogródku otrzymały pisma Kuratorjum z dnia 4 maja Nr. II-9447/33 i oraz z dnia 15 maja Nr. II-13640/33 z powiadomieniem o terminach egzaminów maturalnych i składzie Komisyj Państwowych z zaznaczeniem, że egzaminy odbędą się w lokalach filij.

2. Nieprawdą jest, że rzekomy krok władz szkolnych wywołał wśród młodzieży białoruskiej burzę protestów, a uczniowie filji białoruskiej w Wilnie zagrozili strajkiem i głodówką, natomiast prawdą jest, jak to widać z protokółu Rady Pedagogicznej oraz doniesienia Kierownictwa gimnazjum, iż wogóle żadnej burzy protestów czy też groźby jakimś strajkiem względnie głodówką nie było.

5 Nieprawdą jest, jakoby władze szkolne, odpowiadając przedstawicielom K-tu Rodzicielskiego w tej sprawie, tłumaczyły się jakąś rzekomą pomyłką maszynistki, natomiast prawdą jest, jak to widać z pisma Dyrekcji gimnazjum białoruskiego w Wilnie Nr. 594, że delegacja rodziców po powrocie z Kuratorjum zawiadomiła, iż „audjencja ich u Pana Naczelnika Szkół średnich trwała zaledwie dwie minuty, ponieważ, jak oznajmił p. Naczelnik, plotki o maturze w gimnazjum macierzystem pozbawione są jakichkolwiek podstaw".

4. Nieprawdą jest, jakoby po upaństwowieniu gimnazjum białoruskiego w Wilnie nastąpiły zasadnicze zmiany w składzie grona nauczycielskiego, natomiast prawdą jest, iż w upaństwowionych gimnazjach białoruskich pozostał prawie cały dawny personel nauczycielski.

5. Nidprawdą jest, jakoby wśród nauczycieli Filji Białoruskiej Państwowego Gimnazjum im. J. Słowackiego w Wilnie istniała tendencja wynaradawiania młodzieży białoruskiej, natomiast prawdą jest, że kierunek wychowania narodowego młodzieży białoruskiej nie uległ zmianie, o czem świadczy fakt, że na żadnem z posiedzeń Rady Pedagogicznej, ani też Komisyj Wychowawczych nie była ta sprawa przez nikogo poruszana.

6. Nieprawdą jest, iż rzekomo trudno jest nazwać gimnazjum to szkołą białoruską, natomiast prawdą jest, że filje białoruskie gimnazjów państwowych przeznaczone są wyłącznie dla młodzieży białoruskiej i że wykłady wszystkich przedmiotów, z wyjątkiem języka polskiego, geografji i historji Polski oraz ćwiczeń cielesnych, prowadzone są w filjach białoruskich wyłącznie po białorusku.

p.o. Naczelnik Wydziału
(—) W. Głuchowski.

Увага! — — ЗЬМЕНА АДРЭСУ! — — Увага!

Усе беларускія арганізацыі і інстытуцыі, што дагэтуль мясьціліся ў Вільні пры вул. Людвісарскай 1—19 (Бел. Нац. Камітэт, Бел. Інстытут Гаспадаркі і Культуры, Ц. К.-Б. Х. Д., рэд. „Бел. Крыніцы", „Studenskaj Trybuny" і інш.), а так-жа тыя, што мясьціліся пры вул. Завальнай 6—10 (Бел. друкарня ім. Фр. Скарыны, Бел. Кнігарня "Пагоня", рэд. „Шляху Моладзі" і інш.) —

ад 1-га жніўня с. г.

пераносяцца ў новае памешканьне ў Вільні пры вул. Завальнай 1.
(напроціў былога памешканьня беларускай друкарні).

Рэдактар Ян Пазьняк. Бел. Друк. ім Фр. Скарыны, Вільня. Выдавец А. Шутовіч.